Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

DOI:10.17951/sb.2016.10.153
Studia Białorutenistyczne 10/2016 Literaturoznawstwo

Галіна Тварановіч / Halina Twaranowicz

Uniwersytet w Białymstoku (Polska)
University of Białystok (Poland)

e-mail: kwin@poczta.onet.pl

Беластоцкія этапы жыццёвага і творчага шляху Масея Сяднёва

Białostockie etapy w życiu i twórczości Masieja Siadniowa

The Białystok Stages of the Life and Creative Work of Masiej Sednev

Другая кніга чацвёртага тома акадэмічнай *Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя*, выдадзеная ў 2003 годзе, завяршаецца артыкуламі *Літаратура беларускага замежжа* (Л. Савік), *Наталля Арсеннева* і *Масей Сяднёў* (Я. Чыквін), *Алесь Салавей* (Т. Грамадчанка)[1]. Варта прыгадаць, што публічная гаворка пра эміграцыйную літаратуру, са спробай данесці сутнасць з'явы, распачалася ў Беларусі ў перыяд перабудовы пісьменнікам Барысам Сачанкам у нататках *Беларуская эміграцыя: факты і меркаванні* („Маладосць" 1988, № 10–11), што крыху пазней склалі значную частку яго ж кнігі літаратурна-крытычных артыкулаў і інтэрв'ю *Сняцца сны аб Беларусі*… (1990). Такім чынам, спатрэбілася роўна паўтара дзесяцігоддзя, каб адкрыццё мацерыка беларускага эміграцыйнага пісьменства ўзнялося да навуковага акадэмічнага асэнсавання. Пры тым, трэба адзначыць, што падчас выхаду ўзгаданай другой кнігі чацвёртага тома гісторыі літаратуры, у Беларусі ўжо адбываюцца негатыўныя змены ў адносінах да беларускай літаратуры замежжа. Творчасць выдатных яе майстроў Н. Арсенневай, М. Сяднёва зноў аказалася па-за праграмай навучання ў ВНУ ды школах.

Эвалюцыя крытычна-літаратуразнаўчай рэцэпцыі беларускай эміграцыйнай літаратуры даволі падрабязна разглядалася аўтарам гэтага артыкула ў выступленні на канферэнцыі 2012 года ў Люблінскім каталіцкім універсітэце[2]. Між іншым,

[1] *Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя*. *У 4-х тамах*, Мінск 2003, т. 4, кн. 2, с. 742–822.

[2] Г. Тварановіч, *Беларуская эміграцыйная літаратура: крытычна-літаратуразнаўчая рэцэпцыя*, [w:] *Kultura literacka emigracji rosyjskiej, ukraińskiej i białoruskiej XX wieku: konteksty – estetyka – recepcja*, red. A. Woźniak, Lublin 2013, s. 23–34.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

звярталася ўвага на тое, што першая спроба асэнсавання творчых набыткаў беларускай эміграцыі і найперш яе самой як грамадскай з'явы, заканчвалася амаль адназначна жорсткай высновай: „Што ж, шкадаваць тых, хто пакінуў Радзіму – самае дарагое, што ёсць у чалавека, і не адумаўся, не вярнуўся, не служыць ёй, відаць, ці варта"[3]. Праўда, ужо праз пару гадоў, дзякуючы таму ж Б. Сачанку, выходзіць знакавая кніга *Туга па Радзіме. Паэзія беларускай эміграцыі* з вершамі 16 аўтараў (Наталля Арсеннева, Вінцук Адважны, Алесь Смаленец, Алесь Змагар, Рыгор Крушына, Хведар Ільяшэвіч, Уладзімір Дудзіцкі, Янка Золак, Уладзімір Клішэвіч, Масей Сяднёў, Міхась Кавыль, Янка Юхнавец, Алесь Салавей, Сяргей Ясень, Анатоль Бярозка). Пры чым, абсалютная большасць твораў друкавалася ў Беларусі ўпершыню. У прадмове *Вяртанне дадому* Б. Сачанка, цалкам аспрэчваючы свае яшчэ нядаўнія сцверджанні, падкрэсліваў:

> Надышоў час паглядзець па-новаму і на дыяспару – на тых беларусаў, якія па розных прычынах апынуліся за межамі нашай краіны, жывуць там: іх жа ні многа, ні мала – некалькі мільёнаў. Доўгія гады пра іх нават не ўспаміналі – баяліся як чорт ладана. А калі і згадвалі, дык толькі ў адмоўным плане. Асабліва цяжкія выпрабаванні падалі на галовы тых, хто не выракся роднай мовы, быў нераўнадушны да таго, што дзеялася на Бацькаўшчыне[4].

Найбольш поўна – зразумела, не без падстаў – прадстаўлялася ў гэтай аб'ёмнай кнізе паэзія Н. Арсенневай, М. Сяднёва і А. Салаўя.

Артыкул пра М. Сяднёва ў кнізе Я. Чыквіна *Па прызванні і абавязку* заканчваецца шматзначнай высновай:

> Выразна індывідуальная, шматпланавая творчасць М. Сяднёва, паэта і празаіка, які тварыў па высокаму прызванню і абавязку быць сведкам і адвакатам свайго часу, абаронцам Радзімы, а не пракурорам, адкрывае новыя далягляды ў развіцці беларускага прыгожага пісьменства[5].

Сапраўды, збярогшы ў гранічных выпрабаваннях М. Сяднёва, лёс дазволіў разгарнуцца таленту незвычайнаму, творчая спадчына якога значна ўзбагачае не толькі айчыннае беларускае прыгожае пісьменства, а і арганічна ўваходзіць у агульнаеўрапейскі культурны кантэкст.

Паэт, пісьменнік, перакладчык, намінант на Нобелеўскую прэмію, М. Сяднёў (1913–2001) – аўтар кніг паэзіі *У акіяне ночы* (Рэгенсбург 1946), *Спадзяванні* (Мюнхен 1947), *Цень Янкі Купалы* (Ватэнштат 1947), *На край святла* (Міхельсдорф

[3] Б. Сачанка, *Сняцца сны аб Беларусі*… Літаратурна-крытычныя артыкулы, інтэрв'ю, Мінск 1990, с. 68.

[4] Б. Сачанка, *Вяртанне дадому*, [у:] *Туга па Радзіме. Паэзія беларускай эміграцыі,* укладанне, прадмова і біяграфічныя звесткі Б. Сачанкі, Мінск 1992, с. 5.

[5] Я. Чыквін, *Па прызванні і абавязку. Літаратурна-крытычныя артыкулы*, Беласток 2005, с. 121.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

1947), *Ля ціхай брамы* (Нью-Ёрк 1958), *Патушаныя зоры* (Нью-Ёрк–Мюнхен 1975), *Ачышчэнне агнём* (Глен Коў 1985), *А часу больш, чым вечнасць* (Глен Коў 1989), раманаў *Раман Корзюк* (Нью-Ёрк 1985), *І той дзень надышоў* (Глен Коў–Нью-Ёрк 1987). У 1992 годзе ў мінскім выдавецтве „Мастацкая літаратура" пабачыла свет перавыданне кнігі *Патушаныя зоры*, а яшчэ праз два гады з'явілася *Масеева кніга*, якую склалі ўспаміны, эсэ, старонкі дзённіка, біблейска-іранічныя вершы, пераклады з Мікеланджала, эпісталярый. І нарэшце летась „Беларускі кнігазбор" парадаваў чытача томам М. Сяднёва *Выбраныя творы*. Яго ўкладальнікі Лідзія Савік і Кастусь Цвірка аддалі перавагу празаічным творам – найперш раманам і ўспамінам, эсэ, а вось паэтычная спадчына, на жаль, прадстаўлена ў гэтым выданні досыць сціпла, што ўрэшце і зразумела, бо немагчыма змясціць пад адной вокладкай увесь шматстайны творчы плён пісьменніка.

Напрыканцы энцыклапедычнага артыкула ў біябібліяграфічным слоўніку *Беларускія пісьменнікі* (1995 г.) Барыс Сачанка адзначаў:

> У апошні час, у сувязі са зменамі ў нашай краіне, М. Сяднёў праяўляе вялікую цікавасць да сваёй Радзімы – піша лісты ў рэдакцыі, прысылае свае творы. Газеты „Знамя юности", „Літаратура і мастацтва", часопіс „Маладосць" надрукавалі на сваіх старонках падборкі яго вершаў, часопіс „Нёман" – пераклад рамана *І той дзень надышоў*[6].

Трэба дадаць, што вершы М. Сяднёва друкаваліся ў гэты час і ў часопісе „Крыніца", і ў газеце „Звязда". У маі 1990 года па запрашэнні Васіля Хомчанкі М. Сяднёў упершыню пасля доўгай змушанай ростані з Радзімай нарэшце ступіць на родную зямлю. Наведае яшчэ Беларусь у верасні 1992, а таксама ліпені 1993 і чэрвені-ліпені 1994 гадоў. Раздзел жа *Лісты* ў *Масеевай кнізе* невыпадкова адкрываецца пісьмом В. Хомчанкі ад 2 верасня 1989 года:

> Дарагі Масей Ларывонавіч! Пишу по-русски, чтобы, если кто будет читать, понял все без перевода.
> Я – белорусский писатель Василь Хомченко, твой земляк из села Каничи, что в десяти верстах от Костюкович, от Мокрого – в двадцати.
> Помнишь ли ты меня? Мы ведь очутились вместе в одной камере на улице Урицкого. Были там еще Янка Неманский, Янка Тумилович, Блохман, еще несколько человек и я, студент-рабфаковец, восемнадцатилетний хлопец. О Тумиловиче, Неманском и о тебе я написал воспоминания (ЛіМ и моя книга „Стрэл у акна"). […] Сейчас я работаю над книгой документальных рассказов о тех страшных временах, о лагере, в котором я был четыре года. Я получил тогда немного – четыре года и три поражения. […] О тебе я всегда помнил, стихи твои тоже помню наизусть. Старался о тебе все узнать. И только сейчас дали мне твой адрес. […] Масей, приезжай в Минск, соберись с силами. Все

[6] *Беларускія пісьменнікі. Біябібліяграфічны слоўнік, у 6 тамах*, т. 5, Мінск 1995, с. 468.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

> расходы на прожитие я беру на себя. Никто тебя ни в чем не упрекнет. С тобой хотят встретиться многие. Тебя здесь знают. Съездим на родину[7].

Несправядлівае турэмнае зняволенне, пяць гадоў катаржнай Калымы, горкая доля выгнанніка – гэтыя выключна драматычныя экзістэнцыяльныя выпрабаванні – не дэфармавалі крыўдаю душу М. Сяднёва, не спакусілі заняць „пракурорскую" паставу ў адносінах да роднай краіны. Наадварот, як вялікі сын сваёй зямлі, ён разумеў, што ў асобе кожнага несправядліва пацярпелага скрыўджана яго Радзіма. Сапраўды, насуперак усім іспытам М. Сяднёў быў менавіта *сведкам і адвакатам* свайго часу, абаронцам Радзімы. Неаспрэчным сведчаннем чаго з'яўляюцца, зразумела, яго творы, але і тое, як адразу ўдзячна была скарыстана пісьменнікам магчымасць ступіць на родную зямлю.

На жаль, не суджана было М. Сяднёву наведаць Беласточчыну, дзе знаходзіўся ён з кастрычніка 1943-га па май 1944-га года. Пра беластоцкі перыяд жыцця М. Сяднёў распавёў у аўтабіяграфічным творы *Беластоцкі сшытак. Мая першая прапіска на захадзе*, напісаным у 1991 годзе, калі за плячыма пісьменніка быў ужо яго найбольш плённы ў творчым плане гленкоўскі перыяд. Галоўнаю крыніцаю натхнення аўтара *Масеевай кнігі*, нягледзячы на амерыканскую жыццёвую канкрэтыку, заўсёды была Беларусь; аднак пры відавочнай перавазе ў яго творчасці аўтабіяграфічнага факту, беластоцкі перыяд жыцця М. Сяднёва заставаўся бадай што некранутым, нібыта выспяваў, чакаў свайго часу.

Аказалася, што расповед пра ваенны беластоцкі перыяд мусіў быць запатрабаваны звонку, непасрэдна з самога Беластоку. Пісьменніку, відаць, важна было адчуць зацікаўленасць сваёй асобай і непасрэдна беластоцкім вопытам. І вось 4 сакавіка 1990 года Я. Чыквін, на той час старшыня Праграмнай рады штотыднёвіка „Ніва" і адказны за Літаратурную старонку „Белавежа", змяшчае на ёй падборку эміграцыйнай паэзіі. Зразумела, неабмінуты і М. Сяднёў, за што, атрымаўшы газету, дзякуе Я. Чыквіну лістом ад 7 снежня 1990 года. У сваю чаргу Я. Чыквін звяртаецца 5 лютага 1991 года да Сяднёва:

Калі б Вы хацелі апублікаваць нешта сваё новае ў „Ніве" беластоцкай – пішыце, прысылайце на мой адрас ці проста ў рэдакцыю – будзем рады" (137). М. Сяднёў у лісце ад 29 сакавіка 1991 года дзеліцца:

> Атрымаў я ад Спадара Лубы ліст з просьбай напісаць нешта пра свой, як ён піша, „беластоцкі перыяд". Паабяцаў яму па нейкім часе нешта прыслаць, я прыхільнік Вашай газеты, палюбіў Беласточчыну, жартам называў яе сваёй другой малой Бацькаўшчынай, але звяртацца да таго „беластоцкага перыяду" ня лёгка мне і я пытаюся ў сябе, ці гэта трэба. Што Вы думаеце? Вы-ж таксама просіце мяне нешта напісаць у „Ніву". Дзякую тут Вам за прапанову. Трэба падумаць. Парадзьце мне[8].

[7] М. Сяднёў, *Масеева кніга. Успаміны, старонкі дзённіка, эсэ*, Мінск 1994, с. 85–87. Далей пры спасылцы на гэта выданне ў дужках падаецца старонка.

[8] *Лісты Масея Сяднёва Яну Чыквіну*, „Тэрмапілы" 2013, № 17, с. 239.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

Атрыманы два запрашэнні з Беластоку, а пісьменнік яшчэ вагаецца, ці варта сыходзіць яму памяццю ў рэчаіснасць другой паловы 43-га – першай паловы 44-га гадоў. Праз завалы памяці штосьці ў ім супраціўляецца ўзнаўленню менавіта той пары, як бы падсвядома вычуваючы пэўную небяспеку. Падаецца, што пэўнае тлумачэнне гэткіх адносін да „беластоцкага перыяду" адшукваецца ў мініяцюры М. Сяднёва *Адкрыццё Бацькаўшчыны*, напісанай ім у 1990 годзе па першым наведванні Беларусі:

> Незвычайная істота чалавек – ягоная здольнасць ужывацца. Пажыве дзе, і глядзі – пушчае сваё карэнне, прырастае, звыкаецца з дадзеным асяроддзем. […] Але неспадзявана табе выдарылася нагода наведаць сваю старую, забытую ўжо Бацькаўшчыну. Ты ехаў да яе з няпэўным адчуваннем: што цябе сустрэне там? Ты насцярожаны. Ты як бы сам не свой. Ты пакінуў за сваімі плячыма прывычную, знаёмую ўжо табе новую Бацькаўшчыну, у якой засталіся твае дзеці, унукі […], тут ты набліжаешся да чагосьці ўжо табе незнаёмага і няпэўнага. Ты разгублены. Але ўжо прызямліўся на некалі пакінутай табой зямлі. Не паспеў ты ступіць з самалёта на сходкі, як цябе агарнула лагода нейкага нязнанага дасюль паветра. Ты ўдыхнуў яго і ў цябе закружылася галава, ты на вокамгненне як бы перастаў існаваць […]. Ты пачуў знаёмую табе гамонку, і „прачнуўся" з бясконца доўгага сну. Гэтае „прачнуўся" і было раптоўным адкрыццём заглохлай было ў табе першароднай Бацькаўшчыны. Але чалавек – дзіўная істота. Тут жа, трохі ацверазелы, ты пачаў усведамляць, што ў цябе ж ёсць там, за акіянам, яшчэ адна Бацькаўшчына, дзе ты пакінуў сваіх крэўных, і ты неспадзявана для сябе распалавініўся, раздваіўся на дзве непрымірымыя палавіны.
> О, які гэта боль! Якое засмучэнне агортвае цябе! Ты тут і там. А гэта, можа быць, нідзе. Распалавініцца, значыць – страціць цэласць (12–13).

Відавочна, што ў аснове гэтай мініяцюры, напісанай у 1990 годзе – балесны вопыт першай пасляваеннай сустрэчы з Радзімай самога М. Сяднёва, зразумела, вопыт-рэфлексія, па-мастацку адшліфаваны, абагульнены ўрэшце. Пісьменнік перажыў своеасаблівы стрэс, мусіў прыкласці тытанічныя намаганні, каб паяднаць у сабе гэткія розныя, а лёсава значныя для яго прасторавыя вымярэнні, каб адсутнасць фізічную кампенсаваць прысутнасцю духоўнай у родным Мокрым, у горадзе маладосці Менску. І якраз „беластоцкі перыяд" стаўся той мяжою, за якой чакала М. Сяднёва „распалавіненасць". Берлін, Прага, баварскія Рэгенсбург, Міхельсдорф, ЗША з перапынкам на працу ў Мюнхене і апошні прыстанак – заакеанскі Глен Коў. На Беласточчыне М. Сяднёў назаўсёды развітаўся з бацькам і сястрою і, пэўна, з надзеяй пабачыць некалі маці, а таксама немаўля-сына і любую юную жанчыну… І тое добрае, чым сустрэла М. Сяднёва Беласточчына, доўгі час не магло, мабыць, перакрыць драматызм, нават трагізм абставін, у якіх ён апынуўся. Па сутнасці, у 31 год жыццё трэба было пачынаць наноў. Вяртанне на Беласточчыну, а вяртаўся не проста чалавек у гадах, а вядомы пісьменнік са сваімі творамі, нейкім чынам аднаўляла справядлівасць і, магчыма, па-свойму гарманіза-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

вала ўнутраны свет М. Сяднёва. Думаецца, ён не ўхіліўся ад прапановы напісаць пра свой побыт на Беласточчыне, бо быў ужо прыхільна прыняты ў Беларусі і ўнутрана падрыхтаваны гаварыць і пра гэты свой перыяд, дарэчы, цалкам абмінуты пісьменнікам у абодвух яго вялікіх празаічных творах. Цяпер М. Сяднёў, магчыма, нават меў патрэбу ў тым, каб вызваліць гэткім чынам памяць, падрыхтавацца да новай сустрэчы з Беласточчынай. У лісце ад 15 чэрвеня 1991 года пісьменнік пісаў Я. Чыквіну: „Свой *Беластоцкі сшытак* я скончыў, выйшла сем часцінак. Выслаў іх на імя Спадара Лубы. Хвалююся – ці яны хоць у нейкай ступені задаволілі Рэдактара газэты. Баюся – каб мне сорамна ня было”[9].

Першая частка *Беластоцкага сшытка* выйшла ў 29-ым нумары „Нівы” і затым паасобныя артыкулы друкаваліся кожны тыдзень з тым, што апошні з’явіўся ў „Ніве” якраз першага верасня – на 78-ю гадавіну з дня нараджэння М. Сяднёва. У лісце ад 19 ліпеня 1991 года рэдактар „Нівы” Віталь Луба пісаў М. Сяднёву: „У рэдакцыйным і літаратурным асяроддзі зацікаўленне Вашымі ўспамінамі вялікае. Упершыню можам шчыра і адкрыта даведацца пра той час, які з-за ідэалагічных прычын замоўчваўся або асвятляўся аднабакова” (147).

Пра тое, як аўтар *Беластоцкага сшытка* аказаўся ў Беластоку, ён сціс-ла распавёў ва ўспамінах пра Ларысу Геніюш (1990). З-за небяспекі апынуцца ў канцэнтрацыйным лагеры, а займаў М. Сяднёў на працягу трох ваенных гадоў нейтральную пазіцыю паміж акупантамі і партызанамі, увосень 1943-га разам з бацькам і сястрой вялікім транспартам ён накіроўваецца з Касцюковіч на захад. З Брэста, на той час Брэст-Літоўска, чыгуначны састаў скіравалі на Роўна, Люблін, а пасля зноў вярнулі ў Брэст і далей адправілі ўжо ў Беласток. Успаміны пісьменнік распачынае эпізодам, які не ўвайшоў у *Беластоцкі сшытак*, але мае да яго самае непасрэднае дачыненне: „У Бельску-Падляскім мяне пусцілі з таварнага ў горад – засталіся там бацька і сястра, – і канвой добра ведаў, што нідзе не дзенуся, вярнуся назад. У горадзе тым я хацеў знайсці Беларускі камітэт у надзеі, што ён можа дапамагчы мне ў маёй бядзе” (30–31). Ды ў камітэце нічым не дапамаглі М. Сяднёву – адно што атрымаў ён у падарунак кнігу вершаў *Ад родных ніў* Ларысы Геніюш, да таго невядомай яму паэтэсы.

Урэшце ў Беластоку, з чаго ўласна пачынаецца і *Беластоцкі сшытак*, і „беластоцкі перыяд” пісьменніка, М. Сяднёў знаходзіць Беларускае аб’яднанне, сустракаецца з яго старшынёю Хведарам Ільяшэвічам. Прымаецца на працу карэктарам у газету „Новая дарога”, рэдактарам якой быў Х. Ільяшэвіч, на той час ужо прызнаны паэт. Сам Сяднёў у гутарцы з Б. Сачанкам згадваў пра сваю працу ў штотыднёвіку: „Я стаў беластоцкім паэтам, мае вершы вучылі на памяць, яны друкаваліся ў кожным нумары”[10]. Пра тое, што вершы М. Сяднёва былі адразу заўважаны і прыхільна прыняты, сведчаць і ўспаміны Алены Анішэўскай, надрукаваныя ў беластоцкай „Ніве”:

[9] *Ibidem,* s. 241–242.

[10] *На суд гісторыі. Успаміны, дыялогі*, Мінск 1994, с. 241.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

> У „Новай дарозе” пачалі паяўляцца цікавыя вершы. Іх аўтар – Масей Сяднёў. Прозвішча не з нашага староння. […] Вершы яго шораз больш мне падабаліся, і я пачала іх вырэзваць з газеты і ўкладваць у сшытак. Хацелася мне пабачыць паэта. […] Убачыла я чалавека невысокага росту, бландзіна з лёгка рыжаватым адценнем чупрыны і з быстрым неспакойным поглядам вачэй[11].

Цікава, што ў паэтычнай кнізе М. Сяднёва *Патушаныя зоры*[12] толькі пад вершам *Вёсцы* пазначана, што напісаны ён у Беластоку, хоць на 148-ай старонцы таксама змешчаны, напрыклад, верш *Сябром,* надрукаваны ў „Новай дарозе” 10 красавіка 1944 года. Вершы *Адказ* (Орля 1943) і *На хутары* (Нараўка 13.05.1944) М. Сяднёў па нейкіх прычынах у свае кніжныя выданні не ўключыў. Хоць якраз эмацыянальнае рэха першага з іх выразна гучыць у *Беластоцкім сшытку*:

> […]
> Мне Бацькаўшчына мірсьцілася ў снах,
> Прыглушаная гвалтам, зьдзекам і бядою.
> Я песьнямі адзначыў свой няволі шлях,
> Я сумам напаіў свой верш, нібы дзіця вадою.
>
> Пакутаў зьменшыць я ня мог нічым –
> Стаяла сьмерць кастлявая перад вачыма…
> Я і цяпер балючасьць ран не залячыў,
> Мая душа, парваўшы ланцугі, яшчэ не адпачыла[13].

Шмат увагі ўдзяляе М. Сяднёў у *Беластоцкім сшытку* Беларускаму аб’яднанню, што і зразумела, бо ўсё яго жыццё тут было цесна звязана менавіта з гэтай арганізацыяй, яе дзеячамі. Пры тым пісьменнік не прэтэндуе на дакладныя характарыстыкі, а падкрэслівае, што перадае адно свае ўласныя назіранні, адчуванні. Але ж гэта погляд як назіральніка звонку, так і адначасова погляд знутры, ужо ўдзельніка тутэйшага жыцця:

> Будынак жа, дзе месцілася кіраўніцтва Беларускага аб’яднання ў Беластоку, быў не толькі афіцыйнай установай, а ў пэўным сэнсе менавіта домам, беларускай хатай, у якой і я, бяздомны, знайшоў сабе прыстанішча. У гэтай беларускай хаце я пазнаў людзей, што сталіся мне блізкімі. Я адчуў, менавіта адчуў у іх – смешна пра гэта гаварыць – беларусаў, а разам – Бацькаўшчыну (274).

Высокую ацэнку дае М. Сяднёў газеце „Новая дарога”, называючы яе беларускай газетай па сваёй сутнасці:

[11] А. Анішэўская, *У ваенным Беластоку. Сустрэча з Масеем Сяднёвым*, „Niwa” 2001, nr 21.
[12] М. Сяднёў, *Патушаныя зоры*, Нью-Ёрк–Мюнхен 1975, с. 169.
[13] „Тэрмапілы” 2002, № 6, с. 169.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

> Я назваў бы „Новую дарогу" масавай газетай, стымулянтам беларускага – назавём яго так – руху на Беласточчыне падчас другой сусветнай вайны. Яна была жывой газетай, жыла на энтузіязме найбольш адданых беларускай справе людзей. […] „Новая дарога" была, урэшце, сялянскай газетай: у ёй знаходзіў так ці інакш свой адбітак быт селяніна Беласточчыны (275).

Мела яна шырокае кола карэспандэнтаў-аматараў і карысталася сярод насельніцтва нязменным попытам.

Найбольшым жа дасягненнем Беларускага аб'яднання, на думку М. Сяднёва, было беларускае школьніцтва, якое ахоплівала ўсю Беласточчыну: „Досыць было пабываць толькі на настаўніцкім з'ездзе або курсах па падрыхтоўцы настаўнікаў, каб вас ахапіла адчуванне беларускага духу" (280) – сцвярджае М. Сяднёў. Праз усё жыццё пранёс пісьменнік захапленне жывой, народнай беларускай мовай, якая гучала на Беласточчыне ў адрозненне ад яго родных мясцін у зрусіфікаванай Усходняй Беларусі.

Беластоцкі сшытак – успамін здаля, рэтраспекцыя. У завалах часу штосьці, відаць, паблякла, выветрылася або абвастрылася і гэта датычыцца як плана канкрэтыкі, так і эмацыянальнай сферы, што цвяроза ўсведамляецца самім аўтарам. Як вельмі інтэлігентны, тонкі чалавек, ён нават нібы апраўдваецца, а з-пад яго пяра выходзіць бліскучы псіхалагічны нарыс:

> Мне можна зрабіць закід, што перабольшваю дасягненні беларускага школьніцтва ў Беласточчыне, недаацэньваю тыя цяжкасці і перашкоды, з якімі сутыкалася яно ў сваёй практычнай дзейнасці, што падаю ўсё ў ружовых фарбах, ідэалізую. Але пасля пакут, якія я перад тым зазнаў у сваёй Магілёўшчыне, беларуская Беласточчына здалася мне раем. Адносна мірнае жыццё ў ёй, пагатоў стваральная праца ў выглядзе хоць бы таго ж настаўніцтва ўздзейнічалі на мяне дадатна, і я, чалавек з Усходняй Беларусі, захоплены ўсім новым „заходнім", траціў здольнасць крытычнага падыходу. У маёй памяці засталіся толькі прыгожыя моманты з майго нядоўгага побыту ў Беластоцкім краі. Я заплюшчваў вочы на ўсё тое, што магло параніць параненую ўжо душу. Я заслаўся прыгожым, хоць за яго, за ціхамірнасць і даверлівасць да свету я плаціў і ўсё яшчэ плачу вялікую цану (281–282).

Безумоўна, гаворыцца ў *Беластоцкім сшытку* пра глыбокае ўваходжанне ў родную беларускую стыхію, кранальнае адкрыццё новага ў ёй. Аднак тое, што дастаткова аб'ектыўны назоў твора канкрэтызуецца Сяднёвым цалкам асабістым падзагалоўкам *Мая першая прапіска на Захадзе*, сведчыць і аб тым, што побыт у гэтым родным душы краі месціцца ў свядомасці пісьменніка за „парогам" „старой Бацькаўшчыны", хоць „туга па страчаным" нахлыне на яго пазней, ўжо ў Баварыі[14].

[14] *Ibidem*, s. 280.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

Пра тое, што наведванне Беластоку ўваходзіла ў планы М. Сяднёва, ён неаднойчы засведчыў на працягу першай паловы 90-х гадоў. Як, напрыклад, у лісце ад 23 жніўня 1993 года да А. Анішэўскай: „Быў на з'ездзе (І З'езд беларусаў свету – Г. Т.) і як шкада, што Ты не змагла прыехаць на яго – от была б сустрэча! А мы ж, сапраўды, мусім сустрэцца! І як гэта? Буду ехаць ў Беларусь, буду ехаць праз Варшаву!"[15]. Праз год у лісце да Я. Чыквіна 9 верасня 1994 года аўтар *Беластоцкага сшытку* піша:

> Пры нашай сустрэчы ў Менску дамаўляліся мы (праўда, ня цьвёрда), што я гэтай восеняй споўню Вашае (ужо не першае) запрашэнне, прыеду да Вас у Бельск і такім парадкам мы зможам шмат дзе пабываць, здружыцца яшчэ больш, набрацца ад восені здароўя, пабагацець унутрана ў тым восеньскім спакоі. Але, на жаль, і гэтым разам ня ўдасца мне споўніць сваё вялікае хаценне пабачыцца з Вамі і ўцешыцца Вашай гасьціннасьцяй. Адкладзем гэта да наступнага разу[16].

Пасля ж публікацыі ў „Ніве" значнай часткі *Беластоцкага сшытку*, а таксама рэцэнзіі на кнігу Я. Чыквіна *Светлы міг* М. Сяднёў жартаўліва называе сябе ў лісце (04.08.1991 г) да аўтара кнігі „белавежцам", а ліст ад 12 снежня 1991 года падпісвае „Белавежац М. Сяднёў"[17]. І зразумела, калі „белавежцы" задумваюць на 40-годдзе Беларускага літаратурнага аб'яднання пачаць выдаваць свой часопіс пад сімвалічнай назвай „Тэрмапілы", рэдактар Я. Чыквін запрашае М. Сяднёва ў аўтарскі калектыў, на што адразу атрымлівае згоду з Глен Кова.

Такім чынам, у першым нумары „белавежскага" часопіса пабачыў свет *Нямецкі дзённік* М. Сяднёва, напісаны ім падчас наведвання Мюнхену. З 1969 па 1983 год М. Сяднёў працаваў тут у беларускай секцыі радыёстанцыі „Свабода". „Мюнхенскі перыяд" жыцця, дзякуючы далучэнню да культуры старой Еўропы, магчымасці чытаць у арыгінале нямецкіх класікаў, адыграў асаблівую ролю ў разгортванні творчага патэнцыялу пісьменніка, стаўся своеасаблівым трамплінам для далейшага творчага гленкоўскага ўзлёту паэта і пісьменніка. І невыпадкова, што пазней М. Сяднёў таксама наязджаў у Баварыю. У *Масеевай кнізе* змешчаны запісы з 1992 года *Дзесяць дзён у Мюнхене*. Ужо за плячыма паэта было вялікае для яго вяртанне – вяртанне на Беларусь як творчасцю, так і непасрэдна. І вось чарговае наведванне Мюнхена:

> Захацеў было вярнуцца ў мінулае – паехаў ў Мюнхен, дзе я некалі пражыў немалую часціну свайго жыцця. Увечары, каб ніхто мяне не пазнаў, абышоў знаёмыя мне раней мясціны. Агледзеў таксама той дом, дзе я некалі жыў разам са сваёй сям'ёй. Усё ці бадай усё тут засталося такім, якім было калісьці. Але ўсё яно цяпер не радавала мяне,

[15] А. Анішэўская, *Трымаючы ў руках паходню*, „Тэрмапілы" 2002, №. 6, с. 175.
[16] *Лісты Масея Сяднёва Яну Чыквіну,* с. 246.
[17] *Ibidem*, s. 242, 243.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

> хутчэй засмучала. Тое мінулае, тое калісьці азвалася шчымлівым болем. І я зразумеў – у мінулае нельга вярнуцца, нельга вярнуцца ў тое, што было (201).

Зроблена па-свойму псіхалагічна ўніверсальная выснова, якая, відаць, усё ж не распаўсюджваецца на сустрэчу з Радзімай. Хутчэй наведванне Беларусі ўносіць пэўныя карэктывы ў асэнсаванне М. Сяднёвым добра знаёмых мясцін. І ў адной з нанатак пісьменнік адзначае:

> Адсюль, з Нямеччыны, думаю пра сваю Беларусь, і якой жа ніякай, даруйце, яна выглядае адсюль! У ёй няма яшчэ свайго духу, свайго розуму, інтэлектуальнай моцы, веры ў сябе. У вачах маіх яна заслоненая Чарнобылем. І гэта не песімізм, гэта – замілаванасць да яе (202).

Нібы раптоўна прыходзіць усведамленне, што нягледзячы на добрае валоданне англійскай і нямецкай мовамі, а яшчэ ж і перакладаў М. Сяднёў з іх, аказваюцца яны чужымі, нават малазразумелымі. „Ды што там англійская, нямецкая? Нават расейская застаецца ўжо на ўзбоччы. Я застаюся фактычна толькі з адной мовай – беларускай. Яна сталася ўжо маёй доляй (203)".

І вось запіскі пра побыт у Германіі летам 1997 года. Пісьменнік вельмі лаканічны ў сваіх занатоўках, але гэтая сцісласць не замінае выяўленню істотных думак, пачуццяў:

1. Ад Германіі гэтым разам на мяне дыхнула нечым несамавітым і мая рамантыка страціла свае ружовыя фарбы.
2. Нямецкую законнасць (Gesetzlichkeit) цяжка ператравіць, але каб у нас была такая законнасць, я вітаў бы яе.
3. Кінулася ў вочы нажыва, капіталізм. Думаў, калі наша Беларусь абрасце такім „капіталізмам".
4. Усё-такі я не здольны знайсці сябе ў чужой краіне. Усвядоміў: па-за беларускасцю – не існую. Ты шмат у чым не задаволены ў той беларускасці, але без яе ты непаўнавартасны.
5. Стомлены ад баварскай грунтоўнасці і аднастайнасці[18].

Аб выступленні ж дзявочага хору „Раніца" М. Сяднёў гаворыць падрабязней і эмацыянальней. Ён проста любуецца юнымі спявачкамі і хвалюецца, „як яно ўсё пойдзе, ці будзе публіка". Выконвае хор духоўныя творы Бартнянскага, Рахманінава, Моцарта, а таксама беларускія і рускія народныя песні. Слухачы былі зачараваны цудоўным спевам беларусачак. „А калі заспявалі *Закувай, зязюленька, закувай*, я закуваў і сам: слёзы радасці і смутку былі ачышчэннем душы. Быў я горды за сваіх зямлячак"[19]. Пасля наведвання Тыятынэркірхе запісвае М. Сяд-

[18] М. Сяднёў, *Нямецкі дзённік,* „Тэрмапілы*"* 1998, № 1, с. 45.
[19] *Ibid.*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

нёў шчымлівую рэфлексію пра душэйныя зрухі („шкадаванне ўсяго і сябе самога"), думкі „пра няспыннасць жыцця, пра людскую долю, пра наканаванасць чалавечага лёсу"[20].

Першага верасня 1998 года М. Сяднёву, „выдатнаму эміграцыйнаму беларускаму паэту", споўнілася 85 гадоў, з чым „белавежцы" павіншавалі яго на „тэрмапільскай" старонцы.

У лісце (26.11.1998) да Я. Чыквіна аўтар *Нямецкага дзённіка* дзякаваў рэдактару і між іншага зазначаў:

> „Тэрмапілы" – гэта своеасаблівы каментар да літаратуры беларускай і ў першую чаргу айчыннай, што існавала ва ўмовах савецкай рэчаіснасці, гэта погляд на тую літаратуру звонку, спроба падысці да яе з новым ацэначным крытэрыем. Мне прыгадаўся тут міжволі польскі парыжскі часопіс „Культура". […] Паўтаруся, роля вартавога Вашага часопісу – надзвычайная. Ён жа і – аддушына для аўтараў сьмелых, што не маюць магчымасці быць сабою ў сваёй хаце. Але хацеў бы зазначыць, што часопіс – на маю думку – не павінен быць апазыцыйным, ён мусіць быць вышэй гэтага, ён – ужыву Вашае слоўка – мусіць быць „жыватворчым", созидательным, маючы на ўвазе высокую нацыянальную ідэю[21].

У другі нумар „Тэрмапілаў" аўтар з-пад нью-ёркскага Глен Кова дасылае два свае апавяданні, датаваныя 1998 годам: *Клятва перад Тасканам* і *Развітанне з Калымой*. Самі назвы іх сведчаць пра аўтабіяграфічны характар твораў. Праз шэсцьдзесят гадоў пісьменнік зноў вяртаецца ў сваё драматычна-трагічнае мінулае, можна сказаць, аказваецца ў той прасторы, якую, свядома ці падсвядома, амаль абыходзіў раней увагай у сваіх творах. Толькі сем старонак займае ў рамане *Раман Корзюк* расповяд аб Калыме, як бы не пакінуў калымскі час нічога істотнага ў памяці пісьменніка. Ды, відаць, мае рацыю Я. Чыквін:

> Калыма не заняла ў гэтым творы М. Сяднёва, як можна было спадзявацца, належнага ёй месца, таму што менавіта для яго, тонкага лірыка, далікатнага і чулага чалавека, яна аказалася, па яго словах, „па-за светам", альбо „іншым светам", як акрэсліў Сібір з яе канцэнтрацыйнымі лагерамі сталінскіх часоў польскі празаік Г. Герлінг-Грудзіньскі. Гэта быў той свет, якому, каб з яго выйсці жывым, нельга было супраціўляцца, асобе мус было гэты „іншы свет" „не бачыць"[22].

Сапраўды, герой рамана

[20] *Ibidem*, s. 46.
[21] *Лісты Масея Сяднёва Яну Чыквіну,* с. 254.
[22] Я. Чыквін, *Па прызванні і абавязку*, с. 113.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

> ўвесь аддаваўся згадкам, у сваім уяўленні залятаў з гэтага дзікага, чужога яму краю туды, адкуль ён быў узяты […]. І гэтак бясконца. Ты тут, а на самай справе цябе тут няма, ты там […]. Мройнасць ачышчае цябе, узносіць над тым бяздоннем, перад якім ты стаіш увесь час. Асабліва над такім бяздоннем, як Калыма[23].

У *Клятве перад Тасканам* перажытае стаецца мастацка-эстэтычным фактам, вырастае з удзячнасці-захаплення вялікай чалавечай прыстойнасцю, вернасцю духоўным прынцыпам, якія мосцяць шлях над любой бездань. Пачынаецца твор з канкрэтнага лагернага факту:

> Баптыста, галічаніна, „хахла", як яго часцей называлі, колькі ён ні супраціўляўся, усё ж звязалі і сіламоць абстрыглі. […] Можа й каго іншага гэтак сілком і не стрыглі б, але гвалт над баптыстам учынілі менавіта таму, што ён баптыст, што дзеля нейкай там сваёй веры ён не стрыжэцца. Дык вось і абстрыглі[24].

Такім чынам пісьменнік адразу акцэнтуецца на галоўным героі. Баптыст адмаўляецца ісці на працу ў суботу, у святы, стаіць на сваім да канца, нягледзячы на здзекі і пагрозы. І перамагае – сумленна працуе ў буднія дні, вырабляючы па дзве нормы. Нават арганізуюцца зняволеныя, каб заступіцца за яго перад угалоўнікамі-рэцыдзівістамі, у выніку чаго баптыст аказваецца на нарах побач з апавядальнікам і не можа прамаўчаць, калі людзі побач самі сябе прыніжаюць:

> Лаянка сталася ў нас тым самым сродкам, пры дапамозе якога мы выказваем свае, нават самыя інтымныя пачуцці. Лаянка сталася нашай мова. Падмяніла мову. Вось твой сябра, вядомы беларускі пісьменнік, інтэлігентны чалавек, а паслухаеш яго – перасыпае амаль кожнае слова лаянкай. Або й ты… Чаму ты лаешся, паганіш сваю душу? Хочаш быць такім, як яны? Хочаш змяшацца з імі, каб яны палічылі цябе сваім? Каб табе лягчэй было з імі абыходзіцца? Або хочаш апраўдацца: маўляў цяжкія ўмовы змушаюць. Не, братка, бяры віну на сябе! Страшна не зняволенне, не турма, а страшна абязлюдзіць сябе, страціць воблік чалавека, паддацца Сатане, гэтаму князю света[25].

Пасля закрыцця старых прыскаў з-за вычарпанасці на іх золата, мацнейшых зняволеных пасылаюць на новыя, а слабакоў, „дахадзяг", у ліку якіх аказаўся і апавядальнік, перакідаюць на лесанарыхтоўкі, куды трапляе і баптыст, якога хоча пазбыцца начальства. Баптыст прапануе маладому чалавеку працаваць разам і прыкметна аберагае яго, падстаўляючы сваё плячо пад камель, калі зносяцца нарыхтаваныя за дзень матэрыялы ў штабель або ціха, каб не разбудзіць „падапечнага", точыць пілу.

> А то пад час малітвы тым ці іншым рухам сваёй рукі неўпрыкмець клаў на мяне, яшчэ соннага, тайныя знакі багаславення. Ягоная ўвага, дабрыня цяплілі, ачышчалі маё

[23] М. Сяднёў, *Раман Корзюк*, Нью-Ёрк–Мюнхен, 1985, с. 287, 288.
[24] *Idem*, *Клятва перад Тасканам*, „Тэрмапілы" 1999, № 2, с. 7.
[25] *Ibidem*, s. 8.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

> сэрца, здымалі з яго накіп непрагляднай будзённічыны, змяншалася мая лаянка, хоць ейная аўтаматычнасць яшчэ не пакідала мяне […][26].

Аднак неўзабаве апекуна адправілі ў іншае месца. І падчас знясільваючай працы сам-насам з цяжкім бярвеннем, калі апавядальнік нерваваўся, кіпеў, лаяўся адбываецца нечаканая ўнутраная падзея, сапраўды катарсіс:

> Калі ж закончыў траляроўку, выехаў на прарэзаную ў глыбокім снезе дарогу, знясілены дарэшты, я сеў на свой трактар-сані. Аціх. Супакоіўся. Дзесьці ўнізе вызваляўся з сваіх зімовых акоў Таскан, магутны, ламаў, крышыў лёд, гнаў тоўстыя велічэзныя крыгі, сваім гулам запаўняў прастору. Высокія горы, што абступалі яго, адгукаліся доўгім, урачыстым рэхам. Я слухаў, і гэты велічны гул-гармонія спараджалі мір у маёй душы, я адчуў такое, чаго раней не было – пакору. Адданасць усяму існаму.
> І міжволі я прысягнуў Таскану: ніколі болей[27].

У аснове сюжэту апавядання *Развітанне з Калымой* ляжаць рэальныя факты. Ва ўспамінах *Лёс беларускіх паэтаў* у аповядзе *Вызваленне,* маючы на ўвазе Калыму, М. Сяднёў дзеліцца:

> Я ніколі не думаў, што дажыву да вясны. Але, дзякаваць Богу, дачакаўся яе прыходу – маруднага і нясмелага. Снег растаў, і вызваліліся ад лёду горныя рэкі, якія сваім шумам напаўнялі вялікія прасторы. У гэты час зусім нечакана я атрымаў паведамленне аб тым, што я этапіруюся ў Менск на новае следства. Радасці маёй не было канца. Я даўно б згадзіўся сесці ў турму зноў, каб толькі мяне вывезлі з гэтага выклятага Богам месца[28].

У „тэрмапільскім" апавяданні гісторыя развітання з Калымой нават сагрэта пачуццём гумару. Апавядальнік Масей мучыцца ці не цэлы месяц адным і тым жа сном, у якім з бочкі вылятаюць чорныя сялёдкі. І ўрэшце на дапамогу яму прыходзіць сібірак брыгадзір, вольнанёмны, вядомы сваёй здольнасю разгадваць сны: „Дык гэта, братка, прарочы сон – пойдзеш на волю. Спрасаваныя сялёдкі вылятаюць з бочкі – гэта варушыцца, паднімаецца, пераглядаецца твая справа. Пойдзеш, кажу, на волю"[29]. Ды міналі „пакутныя дні, тыдні, а сібіракова «воля»" так і не прыходзіла, хоць і вера ў яе падтрымлівала на духу, дапамагала выжыць. І ўжо ў канцы ліпеня, калі „наша слабасільная брыгада была занята касьбой", прыйшлі паперы, у якіх апавядальнік адклікаўся ў Мінск. Сон спраўджаўся! У саўгас „Калымскі" герой дайшоў без канвою, а вось адтуль

> быў хутка дастаўлены (ужо пад канвоем) у Магадан, а з Магадану „Трансбалтам" – Ахоцкім і Японскім – у Владывасток. Была раніца, і калі мяне высадзілі з параходу

[26] *Ibid*.
[27] *Ibidem*, s. 9.
[28] М. Сяднёў, *Выбраныя творы*, Мінск 2014, с. 457.
[29] *Idem*, *Развітанне з Калымой,* „Тэрмапілы" 1999, № 2, с. 10.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

> на баржу, я ап'янеў ад гаючага, лагоднага павеву, што нечакана ахінуў мяне. Трэба ж было – аднекуль пачуўся певень. У ранішняй ціхамірнасці прачыналася наваколле. Прачнулася, ажыла і мая збалелая душа. Калыма быццам перастала існаваць. Яе пагасіла ўва мне цеплыня божай міласэрнасці[30].

Тры месяцы этапіраваўся апавядальнік у Мінск на далейшы перагляд справы і ўрэшце зноў аказаўся ў турэмнай камеры да канца чэрвеня 1941 года. Аказаўся, каб, як ні парадаксальна, дзякуючы трагічным варункам выйсці ўрэшце на волю. Аб гэтым у апавяданні *Развітанне з Калымой* М. Сяднёў не згадвае. „А воля? Воля ўвесь час заставалася пад пытаннем. Праройства сібірака ўсё не збывалася"[31]. Магчыма, у далейшым пісьменнік меў намеры звярнуцца да наступных падзей з сваёй жыццёвай эпапеі.

У наступным нумары „Тэрмапілаў" М. Сяднёў пазнаёміў чытача з паэзіяй нямецкіх рамантыкаў Ёзефа Ф. Эйхендорфа і Клеменса Брэтана[32]. Перакладам вершаў папярэднічала лапідарная характарыстыка творчасці паэтаў. У гэтым жа нумары „белавежскага" часопіса была змешчана рэцэнзія М. Сяднёва на кнігу перакладаў з польскай паэзіі Я. Чыквіна *Лісце срэбнай таполі*.

На вялікі жаль, 5 лютага 2001 года Масея Сяднёва не стала. І чарговы 4/5 нумар „Тэрмапілаў" выйшаў ужо без ягоных твораў і распачынаўся вершам-дыптыхам Я. Чыквіна *Бемоль Сяднёва*. Было змешчана таксама ў гэтым нумары эсэ аўтара гэтага артыкула *У вогніве духу паэта*, якое склалі развагі пра паэта і яго лісты ў Мінск і Бельск. У наступным нумары „Тэрмапілаў" з'яўляецца нарыс *Трымаючы ў руках паходню*, у якім пра Масея Сяднёва, яго творчасць і знаёмства з пісьменнікам падчас яго ваеннага побыту на Беласточчыне, а таксама пра аднаўленне сяброўскіх адносін у 1992 годзе, узбагачаючы свой успамін лістамі, распавяла А. Анішэўская. Урэшце два гады таму да стагоддзя з дня нараджэння ў „Тэрмапілах" пабачылі свет лісты М. Сяднёва да Я. Чыквіна.

У слове рэдактара да анталогіі беларускай паэзіі XX стагоддзя Міхася Скоблы *Краса і сіла* Анатоль Сідарэвіч адзначыў:

> Прыканцы XX ст., як і на пачатку яго, беларуская паэзія зноў адзіная і непадзельная. Непадзельнасць азначае, што яна не падзеленая на паэзію ў Беларусі, Падляшшы і на эміграцыі. Калі хто яе і дзеліць, дык гэта палітыкі пэўнага кшталту. […] Адзінства паэзіі азначае толькі адно: яна беларуская, дзе б ні ствараліся тэксты[33].

У выпадку М. Сяднёва гэтая думка знаходзіць асаблівае, можна сказаць, унікальнае пацверджанне нават на ўзроўні жыццёва-творчага шляху, звязанага

[30] *Ibidem*, s. 11.
[31] *Ibid.*
[32] Ё.Ф. Эйхендорф, К. Брэтана, *Вершы*, пер. М. Сяднёва, „Тэрмапілы" 2000, nr 3, с. 109–117.
[33] А. Сідарэвіч, *Стагоддзе паэзіі. Слова рэдактара*, [у:] М. Скобла, *Краса і сіла. Анталогія беларускай паэзіі XX стагоддзя*, Мінск 2003, с. 27.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

са згаданай прасторавай трыядай існавання беларускага прыгожага пісьменства. Несумненна, Беласточчына трывала ўпісана ў біяграфію М. Сяднёва – аднаго з найбольш таленавітых аўтараў „Новай дарогі", „Нівы" і „Тэрмапілаў".

Bibliografia

Aniszeuskaja, A. (2002). Trymajuczy ŭ rukach pachodniu. *Termapiły*, *6*, s. 169.

Aniszeuskaja, A. (2001). U wajennym Biełastoku. Sustrecza z Masiejem Siadniowym. *Hiвa*, 21, s.

Czykwin, J. (2005). *Pa pryzwanni i abawiazku. Litaraturna-krytycznyja artykuły*. Białystok: Uniwersytet w Białymstoku.

Ejchiendorf, J. F., Bretana, K. (2000). Wierszy. Pier. M. Siadniou. *Termapiły, 3*, s. 109–117.

Gniłamiodau, U., Łauszuk, S. (red.). (2003). *Historyja biełaruskaj litaratury XX stahoddzia u czatyroch tamach*. T. 4. Kn. 2. Minsk: Biełaruskaja nawuka.

Maldzis, A. (red). (1995). *Biełaruskija piśmienniki. Bijabiblijahraficzny sloŭnik, u 6 tamach*. T. 5. Minsk: Biełaruskaja encykłapiedyja.

Saczanka, B. (1990). *Sniacca sny ab Biełarusi… Litarturna-krytycznyja artykuły, interwju*. Minsk: Mastackaja litaratura.

Saczanka, B. (1992). Wiartannie da domu. U: Barys Saczanka (układannie, pradmowa i bijagraficznyja wiestki). *Tuga pa Radzimie. Paezija biełaruskaj emigracyji* (s. 3–17). Minsk: Mastackaja litaratura.

Saczanka, I. (red). (1994). *Na sud historyji. Uspaminy, dyjałogi*, Minsk: Mastackaja litaratura.

Siadnioŭ, M. (1999). Klatwa pierad Taskanam. *Termapiły, 2*, s. 44–51.

Siadnioŭ, M. (2013). Listy Masieja Siadniowa Janu Czykwinu. *Termapiły, 17*, s. 237–261.

Siadnioŭ, M. (1994). *Masieewa kniha. Uspaminy, staronki dzionnika, ese.* Minsk: Mastackaja litaratura.

Siadnioŭ, M. (1998). Niamiecki dzionnik. *Termapiły*, *1*, s. 45–46.

Siadnioŭ, M. (1975). *Patuszanyja zory.* Nju-Jork-Miunchen: B. wyd.

Siadnioŭ, M. (1985). *Raman Korziuk*. Nju-Jork-Miunchen: B. wyd.

Siadnioŭ, M. (1999). Razwitannie z Kałymoj. *Termapiły*, *2*, s. 7–11.

Siadnioŭ, M. (2014). *Wybranyja twory.* Minsk: Кнігазбор

Sidarewicz, A. (2003). Stahoddzie paeziji. Słowa redaktora. U: M. Skobła. *Krasa i siła*. *Antałogija biełaruskaj paeziji XX stagoddzia* (s. 5–28). Minsk: Limaryus.

Twaranowicz, H. (2013). Biełaruskaja emihracyjnaja literatura. U: A. Wozniak (red.), *Kultura literacka emigracji rosyjskiej, ukraińskiej i białoruskiej XX wieku: konteksty – estetyka – recepcja* (s. 23–34). Lublin: KUL.

Summary

The paper discusses two essential Białystok-based stages in the life and creative work of Masiej Sednev, one of the most talented representatives of Belarusian emigration literature, and a Nobel Prize nominee. Forced to leave Soviet Belarus for the West, he worked as a proof-reader

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 27/11/2026 01:45:49

in a Belarusian newspaper „The New Road", issued in Bialystok, from October 1943 to May 1944. In 1991 *Bialystok notebook* was published in „Niva", the weekly newspaper of the Belarusians in Poland, where he shares the memories about this stage of his life. Since 1998 a close cooperation began between M. Sednev and the magazine „Termopile", issued by the Belarusian literary association in Poland. The paper analyzes *Bialystok notebook* and the works by M. Sednev, printed in „Termopile", furthermore, attention is drawn to the publications dedicated to the memory of the writer.

Key words: Belarusian migration literature, prose of Masiej Sednev**,** Bialystok stage, connection with the Fatherland, „The new road", „Niva", "Termopile"

Streszczenie

W artykule omówiono dwa zasadnicze białostockie etapy w życiu i twórczości jednego z najbardziej utalentowanych przedstawicieli białoruskiej literatury emigracyjnej, nominowanego do Nagrody Nobla Masieja Siadniowa. Pisarz, zmuszony do wyjazdu z radzieckiej Białorusi na Zachód, od października 1943 do maja 1944 roku pracował jako korektor w białoruskiej gazecie „Nowa Droga", wydawanej w Białymstoku. W 1991 roku w publikowanym w Polsce białoruskim tygodniku „Niwa" drukuje *Zeszyt Białostocki*, w którym po raz pierwszy dzieli się wspomnieniami o tym okresie swojego życia. Od 1998 roku rozpoczyna się ścisła współpraca Masieja Siadniowa z czasopismem „Termopile", wydawanym przez Białoruskie Stowarzyszenie Literackie w Polsce. W artykule analizowane są *Zeszyt Białostocki* i utwory Siadniowa drukowane w „Termopilach", a także publikacje poświęcone pamięci pisarza.

Słowa kluczowe: białoruska literatura emigracyjna, proza Masieja Siadniowa, związki z ojczyzną, „Nowa Droga", „Niwa", „Termopile"

Рэзюме

У артыкуле разглядаюцца два асноўныя беластоцкія этапы ў жыцці і творчасці Масея Сяднёва, аднаго з самых таленавітых прадстаўнікоў беларускай эміграцыйнай літаратуры, які быў у свой час кандыдатам на Нобелеўскую прэмію. Пісьменнік, вымушаны выехаць з Савецкай Беларусі на захад, з кастрычніка 1943-га па май 1944 года працаваў карэктарам беларускай газеты „Новая дарога", якая выдавалася ў Беластоку. У 1991 годзе ў беларускім штотыднёвіку „Ніва" ў Польшчы быў апублікаваны *Беластоцкі сшытак*, у якім пісьменнік упершыню падзяліўся сваімі ўспамінамі пра гэты перыяд свайго жыцця. З 1998 года пачынаецца цеснае супрацоўніцтва Сяднёва з часопісам „Тэрмапілы", які выдаецца Беларускім літаратурным аб'яднаннем у Польшчы. У артыкуле аналізуецца *Беластоцкі сшытак* і творы Сяднёва, апублікаваныя ў „Тэрмапілах", а таксама звяртаецца ўвага на публікацыі, прысвечаныя памяці пісьменніка.

Ключавыя словы: беларуская літаратурная эміграцыя, проза Масея Сяднёва, сувязі з радзімай, „Новая дарога", „Ніва", „Тэрмапілы".